пункта. Мозырь – второй по величине город в Гомельской области. В соответствии с указом Президента Республики Беларуси от 30 августа 2007 г. № 396 Мозырский район и г. Мозырь объединены в одну административную единицу – Мозырский район с административным центром в г. Мозырь.


**Список использованных источников и литературы**

1. Елизаров, С.А. Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919–1991 гг.) / С.А. Елизаров. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. – 222 с.
2. Административно-территориальное устройство БССР : справочник. В 2 т. Т. 1. (1917– 1941 гг.). Гл. архив управ. при Совете Министров БССР, Ин-т философии и права АН БССР ; Воробьева Т.А. [и др.]. – Минск : Беларусь, 1985. – 390 с.
3. Постановления СНК БССР и протоколы заседаний Мозырской окружной комиссии по проведению районирования 1924 г. // Зональный государственный архив в г. Мозыре (далее ЗГАМ). – Ф. 59. – Оп. 1. – Д. 1.
4. ЗГАМ. – Ф. 59. – Оп. 1. – Д. 98.
5. Административно-территориальное устройство БССР : справочник. В 2 т. Т. 2. (1944– 1980 гг.). Гл. архив управ. при Совете Министров БССР, Ин-т философии и права АН БССР ; Гриневич С.Д. [и др.] – Минск : Беларусь, 1987. – 283 с.


## АБ АРГАНІЗАЦЫІ АНТЫФАШЫСЦКАГА РУХУ НА МАЗЫРШЧЫНЕ (1941–1943 ГГ.)


**Л. А. Лісоўскі, В. С. Гусак**
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна


Баі на тэрыторыі Палескай вобласці, цэнтрам якой быў Мазыр, ішлі з 28 чэрвеня па 3 верасня 1941 г. Партыйныя, савецкія, камсамольскія арганізацыі Палескай вобласці прыступілі да арганізацыі спецыяльных атрадаў, якія потым атрымалі назву знішчальных батальёнаў. Яны ствараліся ў райцэнтрах, сельсаветах вобласці [1, с. 192].

ЦК КП(б)Б аказваў дапамогу падполлю Мазыршчыны. У савецкім тыле, каля Бранска, вялася кароткачасовая падрыхтоўка арганізатараў падпольнай і партызанскай барацьбы для акупіраванай Беларусі. Патрыёты растлумачвалі насельніцтву сутнасць фашысцкага «новага парадку», інфармавалі аб становішчы на савецка-германскім фронце, сабатавалі выкананне загадаў і распараджэнняў акупацыйнай адміністрацыі [1, с. 239].

У гады акупацыі гітлераўцы арганізавалі лагер для савецкіх ваеннапалонных у вёсцы Козенкі. У студзені 1942 г. з Оўруча ў лагер акупанты прывезлі палонных чырвонаармейцаў, сярод якіх быў Аляксандр Барысавіч Няпомняшчы. Ён, былы намеснік камандзіра 823-га артылерыйскага палка, стварыў падпольную групу і прыступіў да арганізацыі ўцёкаў ваеннапалонных [2, с. 112].

З ростам партызанскага руху, узмацненнем супраціўлення захопнікам узмацняліся і рэпрэсіі. У шалёнай ярасці гітлераўцы знішчалі мірнае

МГПУ им. И.П. Шамякина

насельніцтва, жанчын, дзяцей, старых [1, с. 198]. Напрыклад, 22 сакавіка 1943 г. у вёсцы Казіміраўка былі растраляны 372 чалавек, у тым ліку жанчыны і дзеці, спалена 76 хат. У чэрвені 1943 г. была спалена вёска Раманаўка, забіта 28 сялян. Жудасную расправу ўчынілі гітлераўцы над жыхарамі вёскі Касцюковічы, дзе 30 чэрвеня 1943 г. былі кінуты жывымі ў калодзежы і спалены 162 чалавекі. Былі спалены многія вёскі раёна. Ад рук акупантаў у раёне загінула больш за 1770 чалавек, а ў Мазыры за час акупацыі гітлераўцы забілі і закатавалі больш як 5500 чалавек [1, с. 203; 2, с. 89].

22 жніўня 1942 г. многія падпольшчыкі былі арыштаваны. Сярод іх – В.І. Крыцкі, М.Ю. Майсееў, І.А. Міцура, Е. В. Сілівончык, Ц.Я. Абрамаў, А.П. Кузьміч і іншыя. Пасля страшэнных катаванняў іх расстралялі, але яны не выдалі сваіх таварышаў па барацьбе. Месца тых, хто загінуў, займалі новыя патрыёты: Лізавета Клямар, Марыя Маргунова, Ганна Родэ, Галіна Траццякова, камсамолец А.І. Шастакоўскі, Ганна Чавус і іншыя.

Былы выкладчык Мазырскага педвучылішча А.С. Мураўёў стварыў новую падпольную арганізацыю, у якую ўвайшлі Н.І. Зуева, К.В. Катлінскі, Т.Я. Есьман і іншыя [1, с. 241].

Падпольная арганізацыя была створана таксама на станцыі Мазыр з васьмі чалавек. Члены гэтых арганізацый у асноўным па заданні партызанскага камандавання вялі разведку сіл праціўніка, распаўсюджвалі антыфашысцкую літаратуру.

Усёй практычнай работай па стварэнні патрыятычнага падполля і першых партызанскіх атрадаў у Беларусі кіраваў ЦК КП(б)Б. Ствараліся партызанскія атрады і на тэрыторыі Палескай вобласці. Тут праходзілі важныя чыгуначныя магістралі, наяўнасць вялікіх лясоў таксама спрыяла развіццю партызанскага руху [1, с. 256].

Мазыр працяглы час служыў базай для накіравання ў тыл ворага на нелегальную работу ў Пінскую, Мінскую і іншыя вобласці [2, с. 117].

Цяжкасці станаўлення партызанскага руху вызначаліся вострым недахопам зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, суровасцю першай ваеннай зімы. Не было вопыту барацьбы з моцным, узброеным ворагам.

З вясны 1942 г. партызанскі рух прымае шырокі размах. У другой палове 1942 г. актывізавалі свае баявыя дзеянні народныя мсціўцы. Так, партызанскі атрад імя Варашылава з 2 па 20 жніўня 1942 г. правёў шэраг баявых аперацый па зрыву паставак правіянту гітлераўцам. Былі разгромлены два малаказборныя сепаратарныя пункты. Вялікую ролю ў развіцці партызанскага руху і патрыятычнага падполля ў гэты час адыгралі ўпаўнаважаныя партыйных і камсамольскіх кіруючых органаў [1, с. 274].

Барацьба з ворагам з кожным днём шырылася. Удары па ворагу нарасталі з павелічэннем сіл атрада, а затым брыгады. Узвод партызан Мазырскага атрада пад камандаваннем П.М. Лузана тры разы рабіў засады на дарозе Мазыр – Скрыгалаў. Вораг панёс страты. 12 красавіка 1943 г. група партызан пад камандаваннем П.М. Лузана зноў арганізавала засаду каля вёскі Хамічкі. Вораг страціў афіцэра і чатырох салдат.

МГПУ им. И.П. Шамякина

25 красавіка 1943 г. быў сфарміраваны склад Мазырскага падпольнага РКП(б)Б. Райкам выдаваў газету «За Радзіму». Выйшла 9 нумароў газеты па 350 экзэмпляраў кожны. Летам і восенню 1943 г. Палескі падпольны абкам і Мазырскі райкам партыі прадоўжылі работу па рэарганізацыі дзеючых і стварэнні новых падпольных арганізацый з камуністаў і беспартыйных патрыётаў. У лістападзе 1943 г. у Мазыры райкам КП(б)Б стварыў падпольную партыйную арганізацыю ў складзе Н.В. Замыка, А.С. Мураўёва і В.П. Хархалева.

У канцы жніўня 1943 г. камандаванне мазырскіх партызанскіх атрадаў прыняло рашэнне разграміць гарнізон праціўніка ў вёсцы Шчакатава. У ноч з 31 жніўня на 1 верасня 1943 г. быў нанесены раптоўны ўдар па гарнізонах Шчакатавы і Слабады. Націск атакуючых прымусіў ворага пакінуць вёскі. Падмацаванне, якое ішло з Козенак, партызаны сустрэлі агнём і рассеялі. Больш за сто акупантаў было выведзена са строю [2, с. 121].

З пачаткам вызвалення савецкімі войскамі тэрыторыі Беларусі перад падпольшчыкамі, партыйнымі органамі, партызанскімі атрадамі і брыгадамі, якія дзейнічалі ва ўсходніх абласцях рэспублікі, паўсталі новыя задачы па арганізацыі цеснага ўзаемадзеяння з савецкімі войскамі і аказанні ім усебаковай і эфектыўнай дапамогі [1, с. 275].

Пасля вызвалення Мазыра баявое ўзаемадзеянне часцей Чырвонай Арміі і мазырскіх партызан не спынялася. Так, 16 студзеня 1944 г. 2-гі атрад сумесна з воінскімі часцямі наступаў на захад да мяжы Петрыкаўскага раёна. 15 студзеня атрад самастойна авалодаў вёскай Перадрэйка Асавецкага сельсавета і ўтрымліваў яе да падыходу савецкіх войск. За актыўную дапамогу воінскім часцям у баях за вызваленне Мазыра і раёна асабоваму складу Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага камандуючы 61-й арміяй генерал-лейтэнант П.А. Бялоў аб'явіў падзяку [2, с. 136].

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Кніга «Памяць». Мазыр і Мазырскі раён. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. – 566 с.

2. Деревни и люди Мозырщины: историко-документальная хроника Мозырского района всех сельских советов и населенных пунктов региона (деревень, поселков и хуторов). – Мозырь : Колор, 2001. – 152 с.

## "БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС" ЯК ПРАСТОРА РАЗВІЦЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

**Н. У. Матусевіч**

Редакция журнала «Беларускі гістарычны часопіс» (г. Минск)

На сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь для навукоўцаў, настаўнікаў і аматараў гісторыі выдаецца "Беларускі гістарычны часопіс" – адзінае поўнакаляровае навукова-тэарэтычнае, навукова-метадычнае штомесячнае ілюстраванае выданне. На падставе рашэння калегіі Вышэйшай атэста-

МГПУ им. И.П. Шамякина